МЕРКАВАННІ

**Наталля КАЧАНАВА:**

## «ЛЮДЗІ ЗРАБІЛІ ВЫСНОВЫ»



«Выбары ў любой краіне — гэта знакавая палітычная падзея, — гаворыць Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА. — Выбары ў нашай краіне праходзяць у адпаведнасці з нашым дзеючым заканадаўствам. Людзі з вялікай адказнасцю за будучыню сваёй краіны, за будучыню свайго народа прымаюць свядомае рашэнне. Мы бачым сур'ёзную актыўнасць нашых людзей, якія прыходзяць на выбарчыя ўчасткі, каб аддаць свой голас за мір, росквіт і будучыню нашай краіны. Мы разумеем, што ёсць нядобразычліўцы, якія хочуць паўплываць на выбары ў нашай краіне. Але мы прыйшлі да гэтых выбараў з добрымі паказчыкамі. Вядома, людзі зрабілі высновы пасля 2020 года. Мы бачым: народ дакладна разумее, што мы маглі страціць тады. Людзі зрабілі высновы, тым больш ёсць з чым параўноўваць».

**Ігар СЕРГЯЕНКА:**

## «ПРАВЯДЗЕННЕМ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА ЗАВЯРШАЕЦЦА ПРАЦЭС АБНАЎЛЕННЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЫ»



«Канстытуцыйныя пераўтварэнні прывялі да ўзмацнення ролі палітычных партый у выбарчым працэсе, аказалі пазітыўны ўплыў на пашырэнне палітычнай адукаванасці і грамадзянскай актыўнасці нашага насельніцтва, — лічыць Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА. — Правядзеннем прэзідэнцкіх выбараў завяршаецца працэс абнаўлення грамадска-палітычнай сістэмы Беларусі. Пачатак палітычнай мадэрнізацыі краіны паклалі змены ў Канстытуцыю Беларусі, прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме ў 2022 годзе. У цэлым, за апошнія гады грамадства значна пасталела ў палітычных адносінах. У абсалютнай большасці насельніцтва ёсць дакладнае разуменне, што лёс краіны можа вырашыць толькі яе народ».

**Ігар ПЕТРЫШЭНКА:**

## «МОЦ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА — У АДЗІНСТВЕ»



«Моц беларускага народа — у актыўнасці і ў адзінстве, — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА, адзначыўшы, што гэта датычыцца ўсіх сфер. — Мы бачым, як той курс, які праводзіцца на працягу апошняга часу, дае сапраўды практычныя эфекты. Прэзідэнт у адпаведнасці з Канстытуцыяй надзелены вялікімі паўнамоцтвамі, і нам важна ўсім вызначаць курс развіцця нашай краіны, укладваць у эфектыўнасць функцыянавання ўсіх інстытутаў улады, у тым ліку інстытута ўлады, які называецца ў нашым асноўным законе, — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Кожны на сваім месцы, дзе б ён ні знаходзіўся, гэты эфект адчувае. Нам неабходна і далей развіваць, каб была пераемнасць, эфектыўнасць функцыянавання, каб дабрабыт кожнага чалавека павышаўся. І тыя рашэнні, якія прымаюцца, мы бачым, даюць сапраўды практычны вынік. Яны не застаюцца на паперы, а рэалізоўваюцца ў кожным кутку нашай краіны».

ЯК ГАЛАСАВАЛА КРАІНА

# У АТМАСФЕРЫ

Апошняя нядзеля студзеня 2025 года вызначыла будучыню Беларусі. І гэта зрабілі мы — беларусы. Мы прыйшлі на выбарчыя ўчасткі, каб выбраць кіраўніка сваёй дзяржавы. Як мы гэта рабілі — у рэпартажах уласных карэспандэнтаў «Звязды» з розных рэгіёнаў.





### «ЗА МІРНАЕ НЕБА»

На выбарчым участку № 1 Ленінскага раёна Брэста зранку ў нядзелю было шматлюдна. Участак размяшчаецца ў Брэсцкім музычным каледжы імя Р. Шырмы, асаблівая атмасфера адчувалася адразу каля ўвахода. Настрой ствараў народны ансамбль цымбалістаў «Лілея».

Цудоўныя беларускія мелодыі выконвалі навучэнкі каледжа Лізавета Качаноўская, Вікторыя Фацеева і Аляксандра Бесан. Іх кіраўнік Таццяна Літвінчук сказала карэспандэнту газеты, што дзяўчаты вельмі адказна падышлі да гэтага даручэння, старанна рыхтаваліся, таму не дзіва, што кожны, хто заходзіць, найперш усміхаецца.

Усміхнулася і Таццяна Безік, якая зайшла выканаць свой грамадзянскі абавязак. Таццяна Аляксандраўна сказала, што жыве ў гэтым раёне даволі доўга, стараецца прыходзіць у асноўны дзень галасавання, таму што абстаноўка ўрачыста-святочная, шмат людзей: «Во як цяпер, музыка бадзёрая, адразу настрой узнімаецца. А галасую я за мірнае неба, за стабільнасць. Гэта лічу самым галоўным на сённяшні дзень».

> **Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО:**
>
> **«Свой голас аддаў за будучыню Беларусі, дзе кожны яе жыхар з гонарам гаворыць: добра там, дзе мы ёсць».**



> **Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН:**
>
> **«Прыходзіць на выбарчы ўчастак разам з сям'ёй стала традыцыяй. Пераемнасць пакаленняў павінна быць у кожнай беларускай сям'і».**



